**Список литературы:**

1. Алексеев, Э. Проблемы формирования лада (на материале якутской народной песни). Исследование / Эдуард Алексеев. – М. : Музыка, 1976. – 288 с.
2. Антропология населения белорусско-польского пограничья в свете этнической истории славян. – Минск : Беларуская навука, 2009. – 264 с.
3. Артамонов, М. Вопросы расселения восточных славян и советская археология / Михаил Артамонов // Проблемы всеобщей истории. – Л. : Изд-во Ленинградского университета, 1967. С. 29–69.
4. Елатов, В. Ритмические основы белорусской народной музыки / Виктор Елатов. – Минск : Наука и техника, 1966. – 218 с.
5. Зверуго, Я. Верхнее Понёманье в IX–XIII вв. / Ярослав Зверуго. – Минск : Наука и техника, 1989. – 209 с.
6. Квитка, К. Явления общности в мелодике и ритмике болгарских народных песен и песен восточных славян / Климент Квитка // Избранные труды. В двух томах. – М. : Сов. композитор, 1971. – Т. 1. – С. 191–212.
7. Кутырёва-Чубаля, Г. Белорусский жнивный напев: архетипы, инновации, диалекты / Галина Кутырёва-Чубаля. – Bielsko-Biała : Wydawnictwo Akademii Techniczno-Humanistycznej w Bielsku-Białej, 2009. – 263 с.
8. Линин, А. Македонскиот стих и напев / Александар Линин. – Скопје : Македонска книга, 1983. – 420 с.
9. Лысенко, П. Дреговичи / Петр Лысенко. – Минск : Навука і тэхніка, 1991. – 244 с.
10. Мартынов, В. Язык в пространстве и времени. К проблеме глоттогенеза славян / Владимир Мартынов. – М. : УРСС, 2004. – 108 с.
11. Музыкальная культура автономных республик РСФСР. – М. : Музгиз, 1957. – 420 с.
12. Руднева, А. Русское народное музыкальное творчество. Очерки по теории фольклора / Анна Руднева. – М. : Композитор, 1994. – 222 с.
13. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 тамах. – Мінск : Чатыры чвэрці, 2001. – Том 1. Магілёўскае Падняпроўе. – 820 с.
14. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 тамах. – Мінск : Бел. Навука, 2004. – Том 2. Віцебскае Падзвінне. – 910 с.
15. Aukštaičių melodijos. Parengė Laima *Burkšaitienė*, Danutė *Krištopaitė*. – Vinius : Vaga, 1990. – 785 p.
16. Godłowski, K. Pierwotne siedziby słowian / K. Godłowski. – Kraków : Instytut Archeologii Uniwersytetu Jagiellońskiego, 2000. – 436 s.
17. Dom na pograniczu. Tom interdyscyplinarny prac naukowych pod red. Libora Pavery. – Bielsko-Biała : Agencja Reklamowa Promix, 2010. – 448 s.
18. Lietuvių tautosaka. Penki tomai. Pirmas tomas. Dainos. – Vilnius : Valstybinė politinės ir mokslinės literatūros leidykla, 1962. – 840 p.
19. Slovenké ľudové piesne. Sväzok II. – Bratislava : Slovenska akademia vied v Bratislave, 1952. – 324 s.



***Аляксей Рагуля***


## У ЭСТАФЕЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАГА СЕМІЁЗІСУ (*да пастаноўкі пытання ў творах Э. Дарашэвіча*)


*У артыкуле даследуецца эвалюцыя культурных сэнсаў беларускага хранатопу, раскрываецца ўзровень інтэрпрэтацыі антрапалагічнага зместу беларускай культуры ў эпоху Асветы, а таксама адсочваецца, як, на думку аўтара, абазначыў сацыякультурныя сэнсы беларускага асветніцтва, вехі духоўнай і інтэлектуальнай эвалюцыі беларускай нацыі ад XVIII ст. да 1830-х гг. у сваіх манаграфіях доктар філасофскіх навук Энгельс Дарашэвіч.*



***Alexey Ragulya***


## AT THE RELAY OF NATIONAL SEMIOSIS *(to the formulation of the question in the works of E. Darashevich)*


*This article explores the evolution of the cultural meanings of the Belarusian chronotope, reveals the level of interpretation of the anthropological content of Belarusian culture during the Enlightenment, and also tracks how, according to the author, Ph. D. Engels Doroshevich outlined the sociocultural meanings of the Belarusian Enlightenment, a milestone in the spiritual and intellectual evolution of the Belarusian nation from XVIII century until the 1830s.*


Канатацыя лексемы *эстафета* ў прозе В. Быкава, як і лексемы *прарыў* у жывапісе М. Савіцкага, адлюстроўвае выйсце нацыянальнай генератыўнай семантыкі на новы ўзровень паглыбленага разумення сучаснага стану чалавечай сітуацыі. Апавяданне «Эстафета» В. Быкава спачатку было надрукавана ў газеце «Во славу Родины» (11.10.1959) пад загалоўкам «Эстафета Победы». Пазней пісьменнік зняў рэдактарскія праўкі. Апошні сказ «Да Перамогі пайшлі другія…» быў заменены: «Эстафету вайны панеслі другія» [1, с. 463]. Аўтарскія праўкі адлюстроўваюць не толькі трагічную сітуацыю самаахвярнай гібелі безыменнага лейтэнанта, сяржанта Лемяшэнкі, знікнення без вестак марудлівага Бабіча падчас атакі на кірху. Эстафетная паэтыка ўзводзіць лакальны хранатоп у з'яву паэталогіі, якая паглыбляе сэнсоўнае бачанне і разуменне эпізода ў вайне, як перманентнай формы чалавечага існавання ва ўмовах ліквідатарскай цывілізацыі.

Характэрны для беларускай сацыякультурнай думкі эстафетны прынцып кампазіцыі мае свае генасеалагічныя вытокі ў фальклорнай паэтыцы плыні, якая з'яўляецца характэрным модулем не толькі ў мастацкай, але і ў філасофскай свядомасці. Выразна гэтая рыса бачыцца ў творчасці пакалення, якому давялося ўступіць у жорсткую барацьбу з нацысцкай і фашысцкай навалай у час Другой сусветнай вайны. У прозе В. Быкава самі ўдзельнікі змагання называюць сябе пакаленнем выбітым. Дзеці і падлеткі ваеннага часу не так яшчэ даўно характарызаваліся як пакаленне, абпаленае вайной у маленстве.

Эстафетная паэтыка адкрывае шлях да паглыбленай і аксіялагічна дакладнай ацэнкі актуальнага сацыяльнага часу. На гэтым напрамку ў нацыянальнай кагніталогіі нашага часу назапашаны багаты вопыт сімвалатворчай дзейнасці, цалкам прыдатнай для таго, каб стварыць на аснове яго семантыкі новую галіну культуразнаўчага ведання – беларускую канцэпталогію. Абноўлена канатацыя вербальнай сімволікі стварае ў сучаснай духоўнай культуры семантычнае поле інтэнсіўнага мыследзеяння, у якім побытавая свядомасць трансфармуецца ў свядомасць паэтычную і філасофскую. Родны кут, Новая зямля, Зерне характва, Раскіданае гняздо, Безназоўнае, Дух непрыгонны, Сам-сітуацыя, Чырвонае ляда, Вязьмо, Забраны край, Зачараваныя гоні, Радасць існавання, Абвостраная цвёрдасць, Дрыгва, Людзі на балоце, Чужая Бацькаўшчына,



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Каней дружбы, Нячывель, Чалавечы знак, Цунамі, Акупацыя, Блакада, Брама неўміручасці, Акамянелыя волаты, Счарнелыя маладзікі, Чалавечы знак – гэта толькі адвольна ўзятыя прыклады, якія тым не менш пераканаўча дэманструюць сэнсатворную актыўнасць сучаснай беларускай мовы, ва ўлонні якой сёння фарміруецца нацыянальны тэзаўрус. Энгельс Дарашэвіч і Уладзімір Конан былі першымі з тых беларускіх філосафаў, якія праблему тэзаўруса паставілі на ўзровень духоўнага самасцвярджэння нацыі ў інтэлектуальнай прасторы. Гэтая задача сёння вырашаецца пераважна сродкамі натуральнай прыроднай мовы. Навязаная ці ўзятая ў арэнду іншанацыянальная мова на чужым грунце страчвае глыбінную семантыку і ператвараецца ў служанку масавай свядомасці, здольнай толькі да мыследзеяння на ўзроўні побытава-эмпірычнай рацыянальнасці. Іншанацыянальная мова на чужым грунце не мае семантычнага рэсурсу, неабходнага для таго, каб пераняць і перадаць эстафету кумулятыўнага сэнсатварэння новым пакаленням, – так, як гэта зрабілі салдаты пакутнага XX в. У якасці прыкладу можна ўзяць адзін з вершаў А. Пысіна: «На суровым сваім рубяжы / Горад падаў грымотнай сцяною. / З камяніц паляцелі стрыжы / Проста ўвысь, проста ў неба начное. / Білі ў нізе агню языкі, / І стагнала зямля валунамі, / А яны паміж зорак луналі, / Як счарнелыя маладзікі. / На далёкай на той вышыні, / Дзе ні гулу, ні гуку, ні кулі, / Птушкі сховішча ў небе знайшлі, / На ляту птушкі ў небе заснулі. / Сон такі незвычайны: крыло / На струмені маўклівым – як вечнасць, / І паветра іх пругка нясло, / Як далей ад бяды чалавечай. / Да людзей горад новы прыйшоў. / Толькі дзесьці далёка ў блакіце / Спяць стрыжы… не будзіце стрыжоў, / Душ адвеяных не разбудзіце» [2, с. 65].

Сэнсавая паліфанія лексемы *вайна* выходзіць далёка замежы актуальнага часу. Гэтае паняцце ў беларускай слоўнай прасторы скіроўвае думку на асэнсаванне мэтазгоднасці зробленага чалавецтвам 10 000 гадоў назад цывілізацыйнага выбару. Марцін Хайдэгер у працы «Выказванне Анаксімандра» звярнуў увагу на адсутнасць у сучаснай антрапалогіі выразнай аксіялагічнай характарыстыкі эпохі і ўяўлення пра будучыню:
«Ці не стаім мы ў надвячорку самай жахлівай перамены ўсёй зямлі і таго часу гістарычнай прасторы, у якой трымаецца гэтая зямля? Ці не стаім мы ў вячэрнім, пярэдадні нейкай ночы, перад нейкім іншым ранкам, ці не для таго мы выйшлі ў дарогу, каб эмігрыраваць у гістарычную краіну гэтага вечаровага канца зямлі?» [3, с. 31].

Пагрозу гібелі чалавецтва ва ўмовах цяперашняй цывілізацыі лічаць сацыяльнай рэальнасцю і аўтары класічнага ўніверсітэцкага падручніка «Сацыяльная антрапалогія» У. Дабранькоў і А. Краўчанка: «Кожны год у чалавечай грамадзе з'яўляюцца дзясяткі новых вірусаў і заразных хваробаў, якія выкошваюць сотні тысяч людзей» [4, с. 630].

Беларуская грамадская думка ў XIX і XX ст. фарміравалася ва ўмовах супрацьстаяння вірусу этналіквідатарскай імперскай ідэалогіі. Філасофскай паэзіі тут належыць пальма першынства: «Я не лічыў бы салдатам сябе, / Каб не гатоў быў прайсці / Праз няўдачы. / Я не лічыў бы аратым сябе, / Каб першы град / Мог скасіць маю веру ў калоссе. / І не лічыў бы паэтам сябе, / Каб кожны мой дзень не быў / Днём нараджэння» [5, с. 488].

У гэтым верлібры М. Танка ў спрошчанай да ўзроўню інсіту ў кумулятыўнай форме адлюстравана нязломная сіла беларускага абагульненага Я, якое рэалізуе сябе ў штодзённай барацьбе супраць духоўнай смерці. Сумарнае Я дзейнічае адразу ў трох аватарах: салдата, аратага і паэта. Такога кшталту хранатоп з'яўляецца характэрным не толькі для фальклору, але і для твораў Ядвігіна Ш., Я. Купалы, Я. Коласа, Я. Драздовіча, А. Куляшова. Павярхоўны погляд трактуе падобны сінкрэтызм як з'яву эклектыкі, не заўважаючы спалучэння сэнсаў агульначалавечага кагніталагічнага вопыту, у сілавым полі якога мяняюцца функцыі і стылістыка прыватных дысцыплін культуразнаўства.

Новая парадыгма беларускага культуразнаўства сёння фарміруецца марудна, але тым не менш паспяхова. Несумненным дасягненнем на гэтым напрамку з'яўляецца інтэграваны падыход. Прынцып халізму рэалізуецца ў адзінстве ўзаемаабумоўленых формаў метафізічнага і эмпірычнага ведання. Устаноўка робіцца на актуалізацыю стваральнай актыўнасці суб'екта культуры – нацыі і асобы.

Кагніталагічны вопыт І. Лушчыцкага, М. Крукоўскага, А. Біралы, М. Алексютовіча, М. Грынчыка, Л. Яўменава, Э. Дарашэвіча, У. Конана, С. Падокшына заключае ў сабе багаты рэсурс, неабходны для сістэматызацыі культурнага працэсу і пераадолення таўталагічнай апісальнасці і фрагментарнасці. Дактрынальнае значэнне ў гісторыі беларускай грамадскай думкі мае вопыт сацыялагічнай матывацыі культурнага працэсу. У пачатку XX ст. пачаў складвацца сінтэз сацыялагічнага і культурна-гістарычнага падыходаў. Гэты працэс быў перарваны ў пачатку 1930-х гг., калі ўладныя ідэалагічныя структуры шырока расчынілі дзверы для аматараў вульгарызацыі сацыялагічнага метаду і ахайвання культурна-гістарычнай школы.

Пасля выкрыцця ў 1956 г. культу асобы Сталіна пераадоленне вульгарызатарскай метадалогіі часам суправаджалася перакрэсліваннем здабыткаў сацыянай эстэтыкі, у выніку чаго ўзнікла пагроза разбурэння табліцы сацыяльна-псіхалагічных элементаў сістэмы ўзаемасувязяў характараў і тыпаў, якая з'яўляецца арганічнай атрыбутыўнай уласцівасцю беларускага антрапалагічнага ведання.

Філосаф Э. Дарашэвіч на працягу ўсяго творчага шляху быў перакананым прыхільнікам арганічнага адзінства сацыялагічнага і культурна-гістарычнага падыходаў. Ён нават не лічыў патрэбным марнаваць час і сілы на эксперыментатарства паводле модных нарацыяў – гульняў у інтэртэкст, «смерць аўтара» і да т.п. У яго фундаментальных даследаваннях пульсуе дамінуючы матыў самасцвярджэння пакалення, якое з маленства кіравалася імператывам, чаканную форму якога выказаў У. Караткевіч: «Быў. Ёсць. Буду». Такая ўстаноўка абумовіла патрэбу пошукавай думкі рухацца сінхронна ў двух супрацьлеглых кірунках – рэтраспектыўным і перспектыўным. Логіка гісторыка-філасофскіх даследаванняў Э. Дарашэвіча, заснаваная на рэфлексіі рэальнага гісторыка-культурнага працэсу, мае сваім вынікам адкрыццё важнейшай інтэнцыі, уласцівай беларускай духоўнай культуры, – ***прайсці праз вернасць.***

Матыў вернасці можна лічыць характэрным для беларускай культуры топасам, пачынаючы з баладаў свіцязянскага цыклу. Да яго неаднаразова звярталіся А. Міцкевіч і М. Танк: «Я спытаў чалавека, які прайшоў праз агонь, і воды, / І медныя трубы: / – Што самае цяжкое / На гэтым свеце? / І ён адказаў: / – Прайсці праз вернасць» [6, с. 7].

Імператыў «Прайсці праз вернасць» у філасофскай спадчыне Э. Дарашэвіча фарміруе своеасаблівае пачуццё ўстойлівасці і пэўнасці ў зменлівым чалавечым свеце. Французкі філосаф Жыль Дэлёз у кнізе «Логіка сэнсу» абазначыў гэты модус лексемай «*план імманенцыі*». Беларуская інтэлегенцыя ў XX стагоддзі апынулася ў сітуацыі выбару: вернасць



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Бацькаўшчыне ці духоўная інтэлектуальная смерць. Урокі пераадолення пагрозы знікнення ў *цёмным царстве* XIX ст. сталі аб'ектам філасофскай рэфлексіі толькі ў другой палове XX ст. Свой творчы шлях праз вернасць Э. Дарашэвіч пачынаў з пераадолення залежнасці ад афіцыйнай ідэалогіі, якую інтэлегенты ў трылогіі Я. Коласа «На ростанях» называюць *казённай трухляцінай.* Будучы рацыяналістам па натуры Э. Дарашэвіч, тым не менш, хутчэй, відаць, творчай інтуіцыяй, чым розумам, улавіў сутнасць імманенцыі беларускай думкі самой сабе. У глыбінях беларускай свядомасці (а, можа, і падсвядомасці) з часоў сівой мінуўшчыны пульсуе пачуццё далучанасці чалавека да *натуральнага парадку* – жыцця ў згодзе з законам агульнай эвалюцыі, які з'яўляецца базавай асновай ранняй натурфіласофіі. У светапоглядный сістэме Ф. Скарыны рэнесансная натурфіласофская канцэпцыя быцця аформлена ў катэгорыях «закон прыроджаны» і «закон пісаны». Э. Дарашэвіч у сваіх манаграфіях «Анёл Доўгірд – мысліцель эпохі Асветы» (1997), «Нарыс гісторыі эстэтычнай думкі Беларусі эпохі Асветы» у сааўтарстве, 1972), «Філасофская і сацыялагічная думка Беларусі эпохі Асветы» (2010) і ў шматлікіх артыкулах абазначыў вехі духоўнай і інтэлектуальнай эвалюцыі беларускай нацыі ад пачатку XVIII ст. да канца 1830-х гг. Сацыякультурныя сэнсы беларускага асветніцтва былі адказам на выклікі, кінутыя Рэчы Паспалітай абодвух народаў рэакцыйнымі рэжымамі Аўстрыі і Расіі. Беларусі яны прызначылі лёс назаўсёды заставацца Паўночна-заходняй сатрапіяй у Расійскай імперыі. У 1832 г. быў ліквідаваны Віленскі ўніверсітэт, у 1841 г. спынена дзеянне беларускай Канстытуцыі – Статута ВКЛ рэдакцыі 1588 г. Замест Уставы на валокі (1557) і копнага суда было замацавана прыгоннае права. Афіцыйная школа мэтанакіравана рыхтавала кадры нацыянальных рэнегатаў – і не толькі з асяроддзя былой магнатэрыі, якая ўжо ў XVII ст. вызваліла сябе ад абавязку прайсці праз вернасць.

Э. Дарашэвіч, даследуючы гісторыю беларускай думкі, не спыняецца на знешніх праявах крызісу ў асяроддзі маёмасных саслоўяў, сцёртых з палітычнай карты некалі магутнай дзяржавы. Даследчык імкнецца выявіць і азначыць той план імманенцыі беларускага этнасу сутнасці, якую мы сёння можам азначыць паняццем *гаспадарская парадыгма.* Э. Дарашэвіча цікавіць пытанне: хто ў Беларусі быў гаспадаром на ніве духу, і ў першую чаргу – хто гаспадар у філасофіі? Асноўным арыенцірам у яго філасофскім пошуку з'яўляецца вопыт народнай універсальнай этыкі і сацыяльнай эстэтыкі. Э. Дарашэвіч абазначыў знакавыя фігуры на шляху беларускага семіёзісу ў эпоху ліквідатарскага разгулу імперскага рацыяналізму. Логіка прапанаванага ім гісторыка-філасофскага дыскурсу перакананаўча адлюстроўвае самастойны характар беларускай культурфіласофскай школы ў эпоху Асветы – яе незалежнасць ад дагматызаванай схаластыкі і карыслівага эмпірызму брытанскага вырабу, а заадно і нямецкага цьмянага трансцэдэнталізму. Прафесар філасофіі Навагрadскага калегіўма *Станіслаў Шадурскі* (1726–1789) у працы «*Філасофскія азначэнні агульнай фізікі»* (1761) лічыў патрэбным падкрэсліць арыгінальны характар філасофскай школы, якая фарміравалася на тэрыторыі беларускага інтэлектуальнага локусу ў эпоху Асветы: «Сістэма Ньютана не ў'яляецца нам прымальнай, пакуль яе прыхільнікі больш ясна не растлумачаць сваю славутую сілу прыцягнення. Незадавальняе нас разгляд непадзельных атамаў эпікурэйцамі з іх найдрабнейшымі пылінкамі. Не можам мы лёгка пагадзіцца з усім, што пастуліравана самім Картэзіем. Да канца не разумеем мы сутнасць манад Лейбніца і тое, чаму яны ўтвараюцца самі з сябе» [7, с. 470].

Філасофія «розуму і адчування» С. Шадурскага рэхам адгукнулася ў пачатку XX ст. запытам: адкуль і што яно ўсё? Сялянскія інтэлегенты ў беларускай псіхааналітычнай прозе пераняли эстафету філасофскага пошуку, уласцівага Задумным і Цікаўным – культурным героям беларускага фальклору.

Логіка гісторыка-філасофскага дыскурсу Э. Дарашэвіча адлюстроўвае арыгінальны характар беларускай культурфіласофскай школы. Беларуская думка развівалася як альтэрнатыва ў адносінах не толькі да дагматызаванай схаластыкі. Карыслівы эмперызм брытанскага вырабу і цьмяны нямецкі транссэндаталізі абсалютнага духоўнага суб'екта таксама быў успрыняты крытычна. Абсалютызацыя нямецкага Я, хай сабе на пачатку і ў абліччы абсалютнага духу, не гарантуе грамадзе адсутнасць тыраніі ў бліжэйшай будучыні. Прыгожымі абяцанкамі часта высцілаюць дарогу ў пекла.

Э. Дарашэвіч адзначае мэтанакіраваны характар творчага пошуку ў беларускай філасофіі эпохі Асветы. Важнае значэнне ў фарміраванні новай метафізікі, заснаванай на асэнсаванні эмпірычнага ведання маюць працы даследчыкаў, якія ў XVIII ст. былі выкладчыкамі ў Наваградскім калегіўме. У 1760-х гг. тут працавалі адначасова Станіслаў Шадурскі і Бенядзікт Дабшэвіч – аўтар трактата «Погляды новых філасафаў». У гэтай кнізе, адзначае Э. Дарашэвіч, распрацавана тое, «што мае адносіны да аналізу паняццяў, тое, што мы ўяўляем як семантыку, прагматыку, семасіялогію і г.д.» [8, 131]. Адначасова Б. Дабшэвіч падкрэслівае фундаментальныя прынцыпы логікі: дастатковай падставы і метадычнага сумнення.

У гістарычнай карціне эвалюцыі беларускай думкі Э. Дарашэвіч разглядае метадалогію братоў *Яна і Анджэя Снядэцкіх* – выхадцаў з Польшчы, якія свой навуковы пошук у розных галінах прыродазнаўства, матэматыкі, гуманітарных навук і філасофіі ажыццяўлялі ў Віленскім універсітэце ў канцы XVIII ст. і пачатку XIX ст. Ян Снядэцкі (1756–1830) лічыў, што філасофія павінна быць заснавана на грунце дакладнага матэматычнага ведання («Разважанне пра пачатак матэматычных навук»). Анджэй Снядэцкі (1768–1838) жыццё трактаваў як спосаб існавання матэрыі, яе пастаянных зменаў («Тэорыя арганічных істот», 1804).

Э. Дарашэвіч у сваіх гіторыка-філасофскіх даследаваннях раскрывае крыніцы самаруху беларускага семіёзісу – народную, у аснове сваёй земляробчую, сістэму светасузірання, тое, што М. Грынчык у кнізе «Фальклорныя традыцыі ў беларускай дакастрычніцкай паэзіі» (1969) азначыў тэрмінам *арганічная народнасць.* Метадалогія земляробчага календара не абмяжоўваецца логіка-паняццевай формай мыследзеяння: філасофія зерня заключае ў сабе энергію абавязковага выйсця, патрэбу «намацаць галінамі сонца» (Я. Колас), прагу працягненага існавання. Гэтая патрэба ў час знаходжання Айчыны ў складзе Расійскай імперыі была рэалізавана праз стварэнне своеасаблівых мінірэспублік, у якіх асвечаныя магнаты (Радзівілы, Храбтовічы, Завішы, Агінскія, Манюшкі, Тызенгаузы, Тышкевічы) адмянілі прыгоннае права, будавалі школы, уводзілі самакіраванне. Жанр ідыліі-сялянкі ў XIX ст. быў адметнай рысай беларускага і польскага культурнага працэсу. Характэрны для Еўрапейскага асветніцтва рух *фізіякратаў* з яго культам зямлі ў Беларусі меў глыбокія гнасеалагічныя карані. На гэтым напрамку ў Беларусі з'явіліся дзеячы рэнесанснага тыпу, якія арганічна спалучалі сацыяльна-культурную дзейнасць з паглыбленым філасофскім яе асэнсаваннем.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Э. Дарашэвіч вылучыў дзве характэрныя для нацыянальнага менталітэту разнавіднасці дзейнага тыпажу, увасобленыя ў творчым абліччы Іяхіма Храптовіча (1729–1812) і Анёла Доўгірда (1776–1835). І. Храбтовіч, заснавальнік Адукацыйнай камісіі, свой палац у Шчорсах ператварыў у своеасаблівы цэнтр нацыянальна-культурнага адраджэння. Плён і ўрокі ўласнай рэфарматарскай дзейнасці ён па-філасофску асэнсаваў у шэрагу ўласных твораў, сярод якіх варта вылучыць перш за ўсё «Пра штогодняе аднаўленне краіны» і «Пра натуральнае права», якія прасякнуты духам фальклорнай дыялектыкі – ідэяй станаўлення суб’екта, здольнага *прайсці праз вернасць, прайсці праз няўдачы.*

Філасофская логіка А. Доўгірда адлюстроўвае пазітыўны вопыт рэфарматарскай дзейнасці і абагульняе вынікі філасофскай падрыхтоўкі навучэнцаў ва ўніверсітэце і калегіўмах: «Як бы там ні было, мне, аднак жа, здаецца, што сапраўдная філасофія не можа пярэчыць звычайнаму розуму і не можа абысціся без яго. Праўда, яна павінна бачыць больш і дакладней, чым звычайны розум, але не можа разбураць яго» [9, с. 420–421].

Логіка прыхільнікаў трансцэндэнтальнага абсалютнага розуму, на думку А. Доўгірда, заахвочвае *няшчасную* рамантычную свядомасць да самаізаляцыі і самасузірання: «Замест таго, каб лічыць логіку навукай найбольш абагульненага мыслення, г.зн. мыслення *пра што-небудзь*, яны так сабе ўявілі і растлумачылі, што нібыта, як ім здавалася, можна думаць ні пра што» [10, с. 454].

Так А. Доўгірд акрэсліў сітуацыю, у якой *няшчасная свядомасць* (тэрмін Гегеля) яшчэ не здольная да рэфлексіі, але ўжо ўмее «думаць бяздум’ем», прынамсі – у псіхааналізе М. Гарэцкага і К. Чорнага на пачатку XX ст.

А. Доўгірд адкрываў шлях станаўлення дыялектыкі, якая затым «павінна ісці наперадзе ўсіх галін ведання, заснаванага на разважаннях так цесна звязаных з метафізікай» [11, с. 424–425] – для таго, каб бачыць і разумець не толькі малое ў складзе вялікага, але і вялікае ў малым.

Дыялектычная логіка А. Доўгірда адкрывае далягляды каштоўнага ведання і разумення напярэдадні пагрозы пазітывісцкага рэдукцыянізму ў навуцы і сацыяльнай практыцы.

**Спіс літаратуры:**

1. Быкаў, В. Збор твораў у шасці тамах / В. Быкаў. – Мінск : Маст. літ., 1994. – Т.6. – 543 с.
2. Пысін, А. Выбраныя творы ў двух тамах / А. Пысін. – Мінск : Маст. літ., 1980. – Т.2. : Вершы, паэмы. – 235 с.
3. Хайдеггер, М. Разговор на просёлочной дороге / М. Хайдеггер. – М. : Высш. шк., 1991. – 192с.
4. Добреньков, В. Социальная антропология. Учебник. / В. Добреньков, А. Кравченко. – М. : ИНФРА-М, 2008. – 688 с.
5. Танк, М. Збор твораў у шасці тамах / М. Танк. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1979. – Т.3. – 560 с.
6. Танк, М. Збор твораў у шасці тамах. – Мінск : Мастацкая літаратура, 1980. – Т.5. – 640 с.
7. Асветнікі зямлі беларускай. Энцыклапедычны даведнік. – Мінск : БелЭн, 2001. – 496 с.
8. Асветнікі зямлі беларускай. Энцыклапедычны даведнік. – Мінск : БелЭн, 2001. – С. 131.
9. Довгирд, А. Разбор книги Феликса Яронского «О философии» / А. Довгирд // Из истории общественно-политической мысли Белоруссии. – Минск : Изд-во АН БССР. – 520 с.
10. Довгирд, А. Логика теоретическая и практическая / А. Довгирд // Очерки общественно-политической мысли Белоруссии. – Минск : Изд-во АН БССР. – 520 с.
11. Довгирд, А. Логика теоретическая и практическая / А. Довгирд // Очерки общественно-политической мысли Белоруссии. – Минск : Изд-во АН БССР. – С. 424–425.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ